Віктар Хурсік



...ня ўсё, ня ўсё яшчэ
мы ведаем пра вайну...

# Трагедыя Крынак

*Уладзіміру Мікалаевічу КJСяЛёВУ*

Успамінаю, як у канцы пяцідзесятых гадоў мы, малыя хлапчукі, з задавальненьнем глядзелі фільмы пра вайну. Нам было ня страшным слова «вайна». Наадварот, калі калгасны воз са скрынямі кінаперасоўкі заязджаў на нашую лясную станцыю, мы хацелі аднога: каб кінамеханік парадаваў словамі: «Ёсьць, ёсьць кіно пра вайну...» Уражаньні ад прагляду карціны падмацоўваліся аповедамі жывых сьведкаў. Паступова складаўся стэрэатып, што вайна, калі ў ёй перамагаюць (а экранныя героі заўсёды перамагалі), ня такая ўжо і страшная. Наадварот, прывабная (вунь, як ушаноўваюць герояў).

Гэта пазьней мы даведаліся ад Васіля Быкава, што сьведкі гаварылі нам ня ўсё, і што вайна – такая ж вялікая трагедыя для простага жыхара на акупаванай тэрыторыі, як і для байца, што кідаецца на дзот, і што разабрацца, часам, цяжка, хто правы, а хто вінаваты на вайне, і што вайна – гэта ня ордэны і слава, а проста мярзотнасьць.

Мярзотнасьць – і сучаснасьць. За ашуканствам, пустаз-

вонствам і фанфарамі засталіся забытымі, пахаванымі не па-людску і героі, і тысячы простых грамадзянаў Беларусі. Іх безыменныя магілкі даўно зарасьлі травою. Толькі вецер ды спадчынны ўспамін захоўваюць памяць пра іх. Зьнікаюць апошнія ўдзельнікі вайны. Разам з імі зьнікаюць і пабудаваныя імі помнікі. Час разбурае насыпех, ад беднасьці, зробленае. У сучасным Садоме не да бронзы і сантыментаў: большасьці няма справы да чужых трагедыяў.

Напісанае ніжэй для тых адзінак, хто хоча разабрацца ў мінулым, у самім сабе, хто праз пакаяньне і роздум ідзе да крыжа праўды і самаспазнаньня. Крыжа, які беларусам яшчэ належыць пранесьці...

Штукары былі бальшавікі, штукары. У былым мястэчку Дараганава, што зараз на Асіповіччыне, імі быў створаны дзіцячы дом, большасьць у якім складалі дзеці расстраляных «ворагаў народу». У пяці кіламетрах ад яго ў Крынцы рупныя наркаматаўцы разьмясьцілі лагер-санаторый для дзяцей асобаў кіруючага складу. Абедзьве дзіцячыя ўстановы месьціліся ў былых палацах паноў Дараганаў на беразе Пцічы. Аднак, на гэтым падабенства і заканчвалася. Бо пакуль гаротныя дзетдомаўцы сёрбалі посную юшку, іх аднагодкі ў Крынцы набіралі вагу. І не прыязджаў ніхто да першых. У той час, як да другіх шыбавалі бацькі з рай, аб і іншых комаў.

Ідылія, што існавала ў Крынцы, грунтавалася на ўпэўненасьці, што лёс дзяцей «ворагаў народу» з дараганаўскага дзетдому ніколі не перасягне пяцікіламетровы пералесак. І, нават увасобіўшыся ў дух, па Пцічы, супраць цячэньня, яму ў Крынку не прабрацца. Да таго ж, у мэтах прафілактыкі, «варожую здань» адганялі ў Крынцы полымем вогнішча, гукамі горну і дробатам барабанаў. Ну а калі б яна і вынырнула дзесьці пасярод ракі, то, пэўна, была б зьнішчаная зычнымі піянерскімі воклічамі ў гонар таварыша Сталіна. Праўда, некаторыя дзеці ня вельмі любілі гэта змаганьне, зьбягалі ад тлуму, каб папесьціцца ў бацькоўскіх «эмках», што час ад часу бачыліся за плотам. Тут пахла мамінай парфумай і шыкоўным дымам ад папяросаў «Казьбек», тут яны адчувалі сябе ў небясьпецы.

Але ідылія для тых, хто прыехаў у лагер напачатку лета 1941 году хутка скончылася. Пакуль дзіцячыя галоўкі сіліліся нешта зразумець, у Крынцы пачуўся вокліч «Halt». І вось ужо запыленыя, расьпярэзаныя варожыя салдаты наводзяць на перапалоханых дзяцей аўтаматы: «Усім заставацца на месцах. З сёньняшняга дня вы знаходзіцеся пад уладай Германіі. У бліжэйшы час сюды завітаюць яе прадстаўнікі. Да гэтага часу нікому тэрыторыю лагеру не пакідаць. За невыкананьне загаду – сьмерць».

Немцы зьехалі. Плакалі напалоханыя дзеці. Выхавацелька хаця і ў саміх у вачах стаялі сьлёзы, іх супакойвалі: «Прыедзе твая мамачка... і твая прыедзе. Усё будзе добра...» Аднак, у той дзень, як толькі барвовае сонца пачало хіліцца да заходу, апусьціліся на Крынку прыцемкі страху і агарнула ноч роспачы.

...З кожным днём становішча ў лагеры пагаршалася. Раставалі мары на вяртаньне дадому, раставалі прыпасы харчу, медыкаментаў. Персанал імкнуўся на свае грошы нешта купіць у недалёкай вёсцы, ды грошы таксама раставалі.

«Новая ўлада» зьявілася не адразу, п’яная: «Шчанюкі... Сволачы бальшавіцка-жыдоўскія. Здохнеце – нам лягчэй будзе. Га-га-га!». Загадчыца ў адказ добра сказала пра Савецкую ўладу, пачала ўшчуваць паліцаяў. Яе адвялі ў лес за лагер і растралялі. Прарвалася, паплыло гора на Крынку. І ўжо нельга было распаліць вогнішча, каб яго адпужаць. Маўчаў горн і таварыш Сталін.

За летам прыйшла зіма. Дзеці ў летняй вопратцы туліліся адзін да аднаго, дрыжэлі, давіліся глыбокім кашлем. Для большасьці выхавацелек яны сталіся чужымі: лагерная зьмена павінна была толькі распачацца, і пазнаёміцца як сьлед з выхаванцамі яны не пасьпелі. Да таго ж у новых умовах дарослыя пачалі дбаць

пра свой лёс, шукалі асабістае выйсьце з трагічнай сітуацыі. Нікога ўжо не зьдзівіла, калі паліцэйскія папоўнілі лагер у Крынцы дзецьмі «ворагаў народу» з дараганаўскага дзіцячага дому: мараль існуе, пакуль ня правіць страх. Дзеці энкэвэдысцкіх катаў і дзеці іх ахвяраў аднолькава пачалі галадаць, хварэць і весьці барацьбу за выжываньне. Не цукерка, а печаная бульбіна стала радасьцю, калі яе не адбіраў дужэйшы. Каб не маленькія дзеці, то, пэўна, і забыліся б пра сьвет людзей, зьдзічэлі б, пагрызьлі б адзін аднога малалетнія вязьні Крынкі. Але гэтыя нэндзы ўсё клікалі і клікалі маці...

*Са сьледчых дакументаў:*

«У канцы 1941 году намесьнікам дырэктара дзіцячага дому «Крынка» акупантамі была прызначаная Вера Пятроўна Ждановіч, 1913 году нараджэньня, нарадзілася ў горадзе Лібава, руская, адукацыя сярэдняя, жыла ў Асіповічах. Як вынікае з паказаньняў сьведкаў, фактычна В. Ждановіч ажыцьцяўляла кіраваньне ў згаданай установе. З дававеннага жыцьця характарызуецца адмоўна, як жанчына лёгкіх паводзінаў».

Падчас працы ў дзіцячым доме «Крынка» В. Ждановіч выхоўвала дзяцей у прафашысцкім духу, арганізавала ў лагеры дзіцячы хор, які пад яе кіраўніцтвам неаднаразова выступаў з канцэртамі для нямецкага гарнізону ў Асіповічах. У райцэнтр прыязджала часта. Заўважана, што неаднаразова на ганку гарадской управы яе сустракаў начальнік раёну Гаранін. Яны цалаваліся.

У Крынцы Ждановіч наведвалі нямецкія афіцэры. З паказаньняў афіцэра 608 ахоўнага палка вермахту Эрыха Нордбука вынікае, што Вера Ждановіч была даверанай асобай камандаваньня палка. Жаночыя якасьці падсьледнай ён ахарактарызаваў у вышэйшай ступені. Ждановіч сістэматычна наведваў нямецкі афіцэр Бем (ён прыносіў ёй адэкалон, а аднойчы падараваў атрыманы з Германіі торт), сустракалася яна і з іншымі афіцэрамі вермахту.

Падчас знаходжаньня Ждановіч у дзіцячым доме яе метады кіраваньня вызначаліся гранічнай жорсткасьцю. Яна ўвяла пакараньне карцэрам, выганяла дзяцей босымі на сьнег, забараніла ім жабраваць па суседніх вёсках, забараніла нават пекчы бульбу ў печы. Пасьля знахожаньня зімой ў халодным карцэры дзеці цяжка хварэлі, а дванаццацігадовы Саша Асмалоўскі памёр.

*З паказаньняў Кірылы Сашчэкі, атрыманых сьледчым контрразьведкі Міністэрства дзяржбясьпекі вайсковай часткі 19691 гвардыі капітанам Камаровым на допыце 21.10.1949:*

«У лістападзе ці студзені 1941 году я паступіў у крынкаўскую паліцыю, дзе служыў намесьнікам начальніка.

У пачатку мая 1942 году я ад начальніка крынкаўскай паліцыі Яфрэма Паўлавіча Ярашэвіча (асуджаны) атрымаў загад са сваімі паліцэйскімі накіравацца ў дзіцячы санаторый «Крынка», дзе ў той час знаходзілася каля 300 дзяцей, з мэтай акружыць згаданы санаторый і не дапусьціць выхаду дзяцей. Яўрэйскіх дзяцей належала адабраць і накіраваць у в. Крынка, а адтуль быццам бы накіраваць у г. Бабруйск у дзіцячы дом для дзяцей яўрэйскай нацыянальнасьці. Сабраўшы паліцэйскіх, я аб’явіў ім мэту, з якой мы павінны ісьці ў санаторый.

Прыбыўшы ў санаторый «Крынка», я расставіў паліцэйскіх вакол санаторыя з разьлікам, каб не дапусьціць уцёкаў дзяцей, і, знаходзячыся каля ўваходу ў санаторый, стаў чакаць прыезду бургамістра Дараганаўскай воласьці Балоцькі.

Прыкладна ў 12 гадзінаў дня Балоцька з дараганаўскай паліцыяй у складзе 10 чалавек прыбыў на трох падводах. Для сустрэчы яго з дзетдому выйшлі дырэктар Шыпенка і намесьнік дырэктара Вера Ждановіч. Гэта я бачыў асабіста, бо знаходзіўся непадалёк ад уваходу ў будынак.

Разам з Шыпенкам, Ждановіч і Балоцькам я зайшоў у памяшканьне дзетдому. Туды ж увайшла і частка паліцэйскіх.

Усе дзеці былі сабраныя ў агульнай зале, якая знаходзілася на другім паверсе. Дзеці прыбылі групамі, разам з выхавацелькамі. Бургамістр Балоцька пачаў па сьпісе выклікаць дзяцей яўрэйскай нацыянальнасьці. Выхавацелькі выводзілі выхаванца і накіроўвалі ў другі бок залы. Калі такім чынам яўрэйскія дзеці былі аддзеленыя ад астатніх, Балоцька аб'явіў, што іх павядуць у вёску Крынка, а потым адправяць у Бабруйск.

Пасьля гэтага адабраных дзяцей вывелі на вуліцу, пастроілі ў калону, а паліцэйскія крынкаўскай і дараганаўскай паліцыі ўзялі калону пад варту».

Калі паліцэйскія пачалі адбор, дзеці ўжо здагадваліся, што іх чакае наперадзе. Дзьве дзяўчынкі Валя Фрыдлянд і Рая Віньнік паціху аддзяліліся ад астатніх і схаваліся ў адным з пакояў. Аднак Ждановіч вярнула іх у залу. Гэты выпадак вывеў яе з раўнавагі, і яна пайшла абыходзіць усе памяшканьні. У адным з іх знайшла хлапчука, які забіўся пад ложак. Ён таксама быў дастаўлены ў строй.

Падчас адбору дзяцей у агульную залу былі выкліканыя супрацоўніцы лагеру яўрэйскай нацыянальнасьці: сталага ўзросту прафесар-рэнтгенолаг Марыя Ісакаўна Рохліна, трыццацігадовая ясельная сястра Тамара Дрон і медсястра Марыя. Апошняй можна было застацца жывой, паколькі ўсе яе лічылі полькай. Аднак у калону трапіў яе сын. Яна хацела выратаваць яго, але паліцэйскія білі і адштурхоўвалі маці. Тады Марыя сама папрасілася да сына...

*З паказаньняў Кірылы Сашчэкі:*

«Акрамя дарослых дзяцей яўрэйскай нацыянальнасьці ва ўзросьце ад 4 да 14 гадоў, былі ўзятыя дзеці ясельнага ўзросту ад 1 да 3 гадоў. Гэтых дзяцей (дзесьці каля пятнаццаці чалавек) выхавацелькі выносілі з памяшканьня і садзілі на падводы на якіх прыехаў Балоцька і дараганаўская паліцыя.

Такім чынам з дзетдому «Крынка» былі атабраныя дзеці ў агульнай колькасьці больш за 80 чалавек і дзьве пажылыя жанчыны. Яны былі адведзеныя ў вёску Крынка і разьмешчаныя ў памяшканьні былой калгаснай канцылярыі. Памяшканьне намі ахоўвалася.

Хутка зьявіліся немцы. Калона зноў была пастроеная і пачала рухацца да шашы Асіповічы-Бабоўня. З ліку паліцэйскіх у гэты час па ўласнай ініцыятыве пайшлі канваіраваць дзяцей разам з немцамі я і паліцэйскі Пінчук. Астатнія паліцэйскія засталіся ў вёсцы Крынка. Прайшоўшы з кіламетр, немцы прыпынілі калону на ўскрайку лесу і тут жа пачалі расстрэльваць дзяцей у яме, загадзя прыгатаванай начальнікам паліцыі Ярашэвічам. Ён чакаў нашага прыбыцьця. Гэта драпежніцтва ажыцьцяўлялася такім чынам. Калі калона была прыпыненая, частка немцаў, а таксама я, Ярашэвіч і Пінчук засталіся ахоўваць дзяцей, а два немцы падводзілі і кідалі ў яму дзяцей групамі па 7-10 чалавек. Дзеці плакалі і прасілі аб літасьці. Трэці немец з аўтамату расстрэльваў іх ужо ў яме. Калі дарослыя жанчыны і дзеці, што маглі хадзіць, былі расстраляныя мы падвезьлі да ямы дзяцей ва ўзросьце 1-2 гадоў, што знаходзіліся на падводах. Тыя ж немцы здымалі і кідалі іх у тую ж яму і тут жа расстрэльвалі. Калі гэта злачынства было ўчыненае, немцы пайшлі да аўтамашыны, што чакала іх на шашы, і паехалі. Мы разам з паліцэйскімі і іншымі грамадзянамі, што капалі яму, засыпалі яе і пайшлі ў Крынку. Ва ўчыненьні гэтага жудаснага злачынства я прымаў непасрэдны ўдзел».

Сьледчы: Вы сьцьвярджаеце, што і Ждановіч прымала ўдзел у гэтым злачынстве. Якім чынам?

*З паказаньняў Кірылы Сашчэкі:*

«Я сьцьвярджаю, што дзеці з дзетдому «Крынка» былі расстраляныя па ініцыятыве дырэктара і яго намесьніцы. Гэта мне вядома таму, што пасьля ўчыненага злачынства я, як намесьнік начальніка паліцыі, прысутнічаў пры размове начальніка паліцыі Ярашэвіча і бургамістра Крынкі Балоцькі. Яны казалі, што

Дзановіч увесь час патрабавала ад нямецкіх уладаў, каб дзяцей яўрэйскай нацыянальнасьці з дзетдому ўбралі. Яна непасрэдна прысутнічала пры адборы, стаяла побач з бургамістрам. Калі дзяцей выводзілі на двор, яна давала распараджэньні выхавацелькам, адчувалася, што яна старшая і кіруе імі. Калі павялі калону, Ждановіч, дырэктар і бургамістр сядзелі на лаве ля дзіцячага дому як ні ў чым не бывала...»

Дзіва, але з калоны двум дзеткам удалося зьбегчы. Мусіць праз дзень да лагеру выйшаў галодны хлопчык Ізя. Дзіця ня ведала вакольнай мясцовасьці, баялася людзей. Прабыўшы суткі ў халодным лесе, яно падалося назад у лагер, туды, дзе, па яго меркаваньні, можна было знайсьці заступніцтва. Прыход Ізі перапалохаў Ждановіч. Паліцаі спрацавалі ня чыста, гэта магло раззлаваць немцаў. Праз некалькі дзён за ўцекачом прыехаў на аўтамашыне з Асіповічаў сам начальнік раёну Гаранін. Пазьней хлопчык быў расстраляны.

Другому выхаванцу Валодзю Сьвярдлову пашанцавала больш, ён у лагер больш не вяртаўся. Наадварот, бег ад яго. У адной з вёсак яго, галоднага, абдзёртага выратавала і прытуліла на час вайны жанчына. Ён жывы і зараз.

А які ж лёс Веры Ждановіч? Увесь час, дзякуючы сваёй крывадушнасьці і «абаяльнасьці», яна ладзіла з немцамі. У 1944-м ужо не адмаўляла і партызанам. Таму добрую характарыстыку даў ёй тады зусім малады камандзір мясцовай партызанскай брыгады (ён жыве і зараз). Зразумела, што аб сваёй ролі ў расстрэле дзяцей Ждановіч яму не казала.

Пасьля вызваленьня Асіповіцкага раёну Ждановіч, каб пазьбегнуць кары, пачала ліхаманкава шукаць трывалую апору. Яна спакусіла жанатага камандзіра вайсковай часткі, што разьмясьцілася ў райцэнтры. Абываталі давялі да вушэй камандзіра характарыстыку і дзеі палюбоўніцы, але ў адказ, п’яны і разьюшаны, ён хапаў пісталет і казаў, што перастраляе ўсіх, хто скажа хоць слоўца на адрас «яго Верачкі».

Пакрысе дайшло да сьледства.

Паказаньняў было дастаткова, але «прабуксоўкі» былі відавочнымі. Куды больш дробныя злачынцы ўжо былі асуджаныя, а Ждановіч усё гуляла на свабодзе. Відаць, жаночыя чары дзейнічалі і на сьледчых.

Урэшце, яна была асуджаная на дзесяць гадоў пазбаўленьня волі, з якіх адсядзела толькі пяць. Дапамаглі вядомыя і, відаць, невядомыя заступнікі.

Уласных дзяцей у пачвары ніколі не было...

Ніхто зараз не патлумачыць, чаму адбылася трагедыя ў Крынцы. Як магло здарыцца, што элітны дзіцячы санаторый з поўным штатам быў пакінуты на міласьць ворагу. Чаму бацькі на “эмках” ня кінуліся ратаваць сваіх дзяцей? Чаму не зрабілі гэтага партыйныя, савецкія ці камсамольскія арганізацыі тагачаснага Старадарожскага раёну? Дзіцячы санаторый ня быў эвакуіраваны і жыў сваім жыцьцём. У час акупацыі дзіцячы дом знаходзіўся ў зоне дзеяньня партызанскіх атрадаў. Аднак ніводны з іх ня ўзяў на сябе адказнасьць за лёс дзяцей. Ці мо партызаны, ня маючы магчымасьці забраць дзяцей у лес, верылі ў лаяльнасьць фашыстаў? Чаму ж тады адбылася трагедыя з расстрэлам васьмідзесяці выхаванцаў?

Ня ўсё, ня ўсё яшчэ мы ведаем пра вайну...